ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1986
27
ЛІСТАПАДА
ЧАЦВЕР
№ 31(1517)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

Беларускі універсітэт
ТЭЛЕТАЙП
*УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА*

## Конкурс

маладых лектараў — студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў праводзіцца ў БССР з лістапада 1986 года па красавік 1987 года ў адпаведнасці з пастановай калегіі МінВНУ БССР і прэзідыума праўлення Таварыства «Веды» БССР. Галоўныя задачы конкурсу: развіццё інтарэсу студэнтаў да вусных публічных выступленняў, актывізацыя работы школ маладога лектара па вывучэнню і прапагандзе рашэнняў XXVII з'езда КПСС.

Студэнтам, якія жадаюць прыняць удзел у конкурсе, належыць да 8 снежня здаць тэзісы сваіх конкурсных выступленняў аб'ёмам 2—3 старонкі ў камітэт камсамола БДУ. Універсітэцкі тур адбудзецца з 10 па 13 снежня. Пераможцы конкурсу прымуць удзел у абласным туры агляду (снежань — сакавік 1987 г.).

А. ГРЫЦАНАЎ,
кіраўнік школы
маладога лектара.

## Навуковы калёквіум

«Сацыяльна-эканамічныя перадумовы Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі» праведзены на кафедры гісторыі СССР дасавецкага перыяду.

У дыскусіях прынялі ўдзел выкладчыкі і студэнты БДУ, вучоныя з Масквы і Ленінграда, госці з ГДР і КНР. З вялікай цікавасцю ўдзельнікамі калёквіума былі заслуханы даклады старшага навуковага супрацоўніка Ленінградскага аддзялення Інстытута гісторыі АН СССР В. Р. Чарнуха, прафесара Йенскага універсітэта (ГДР) У. Д. Іены, выкладчыка МДУ А. П. Шавырова.

С. ПОЗНЯК,
дацэнт кафедры
гісторыі СССР
дасавецкага перыяду.

## КВЗ

— клуб вясёлых і знаходлівых, як вы ведаеце, атрымаў другое жыццё. Ідэя ўзнавіць правядзенне цікавага конкурсу так спадабалася студэнтам фізічнага факультэта, што яны выступілі з ініцыятывай стварыць у БДУ свой клуб, каб мець магчымасць падаць заяўку на ўдзел у гульні па ЦТ. Камітэт камсамола падтрымаў фізікаў і аб'явіў падрыхтоўчы перыяд з мэтай фарміравання універсітэцкай каманды. Агляд-конкурс адбудзецца ў снежні — студзені.

А. ВІХРОВА.



НАШ ФОТАКОНКУРС

*ВОЛЬГА СУХАМАЗАВА — студэнтка чацвёртага курса факультэта журналістыкі. Ветлівая, добразычлівая, яна карыстаецца павагай у аднакурснікаў, заўсёды ў гушчыні ўсіх спраў. У яе залікоўцы толькі добрыя і выдатныя адзнакі.*

*У В. Сухамазавай шмат захапленняў і інтарэсаў. Кнігі, кіно, сучасная і класічная музыка — гэта толькі няпоўны пералік іх. Але галоўнае — спорт. У свой час яна была членам зборнай краіны па лёгкай атлетыцы, чэмпіёнкай РСФСР. Цяпер, развітаўшыся з вялікім спортам, Вольга дастойна абараняе спартыўны гонар факультэта і універсітэта.*

*Здымак дасланы на фотаконкурс студэнтам другога курса факультэта журналістыкі А. МАКСІМАВЫМ.*

ПЕРАБУДОВА ВНУ: СТРАТЭГІЯ І ТАКТЫКА ПАСКАРЭННЯ

# АСОБА ВЫКЛАДЧЫКА

Вызначаныя партыяй шляхі ўдасканалення работы вышэйшай школы абапіраюцца на назапашаны вопыт. Крытычны аналіз зробленага, аб'ектыўная ацэнка навуковага і творчага патэнцыялу ВНУ, а таксама агульнага становішча падрыхтоўкі кадраў у краіне пераконваюць у тым, наколькі своечасовая перабудова.

У гэтых умовах набывае асаблівы сэнс, патрабуе сур'ёзнай увагі праблема педагога, бо тэмпы навукова-тэхнічнага прагрэсу, паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны ў першую чаргу залежаць ад прафесійнага ўзроўню тых, хто яго арганізоўвае.

У ВНУ БЕЛАРУСІ працуюць 373 выкладчыкі гісторыі КПСС. За гады мінулай пяцігодкі абаронена 7 доктарскіх і 34 кандыдацкія дысертацыі. Выкладчыкі гісторыі партыі з вучонымі ступенямі і званнямі складаюць цяпер у рэспубліцы больш як 66 працэнтаў, а на кафедрах гісторыі КПСС нашага універсітэта — 90 працэнтаў. Безумоўна, што павелічэнне колькасці асоб з вучонымі ступенямі стварае важкі патэнцыял для павышэння якасці вучэбных заняткаў. Аднак само па сабе гэта яшчэ не прадугледжвае аўтаматычнага паляпшэння вучэбнай работы, педагагічнага майстэрства выкладчыкаў, больш глыбокіх ведаў студэнтаў. Ды і тэмпы паляпшэння саставу кафедраў адстаюць ад тых магчымасцей, якія мы маем.

Сёння, ва ўмовах перабудовы вышэйшай школы, нашу дзейнасць неабходна разглядаць праз прызму ўзрастаючай адказнасці кожнага выкладчыка гісторыі КПСС з высокіх патрабаванняў XXVII з'езда. Яны дапамагаюць больш дакладна ўбачыць бягучыя і перспектыўныя задачы, больш глыбока асэнсаваць шляхі іх дасягнення.

Мы дамагаемся, каб кожны выкладчык быў не проста настаўнікам, а арганізатарам пазнавальнай дзейнасці студэнтаў, развіваў іх мысленне, творчасць, садзейнічаў самаразвіццю, ствараў умовы для пераходу ад вучэбна-сузіральнай да вучэбна-стваральнай дзейнасці. Словам, каб заняткі па гісторыі КПСС былі для студэнтаў урокамі жыцця, адказнасці, ідэйнага, духоўнага імкнення, давалі ім зарад палітычнай і маральнай сілы, указвалі шляхі вырашэння складаных задач.

У Белдзяржуніверсітэце, у іншых ВНУ рэспублікі для маладых выкладчыкаў арганізуюцца лекторыі педагагічнага майстэрства. У абласных цэнтрах працуюць метадычныя семінары выкладчыкаў грамадскіх навук, на якіх абмяркоўваюцца тэарэтычныя і метадычныя пытанні. Па нашай думцы, павышэнню навуковай кваліфікацыі і педагагічнага майстэрства выкладчыкаў спрыяюць пастаянна мацнеючыя сувязі кафедраў з навукова-даследчымі інстытутамі. Мы лічым, што ў справе ўдасканалення падрыхтоўкі кадраў, паляпшэння навукова-даследчай работы выкладчыкаў сваю ролю адыгрывае распрацаваная сумесна з Інстытутам гісторыі партыі рэспубліканская комплексная праграма

(Заканчэнне на 2-й стар.).

СТУДЭНЦКАЕ НАВУКОВАЕ ТАВАРЫСТВА

Навукова-даследчы гурток па гісторыі Беларусі — адзін са старэйшых на гістарычным факультэце. Гуртkоўцы займаюцца вывучэннем сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця Беларусі. Для гэтай мэты выкарыстоўваюцца розныя формы работы.

# Да глыбінь гісторыі

ДЛЯ ПРАВЯДЗЕННЯ пасяджэння гуртка, прысвечанага 90-годдзю з дня нараджэння А. Ф. Мяснікова, былі падрыхтаваны даклад «А. Ф. Мяснікоў і Беларусь», а таксама інфармацыя аб кнігах, артыкулах, напісаных ім і расказваючых пра яго.

Да сябе ў госці мы запрашалі вядомых беларускіх вучоных, літаратурных супрацоўнікаў, пісьменнікаў. Да 160-годдзя з дня паўстання дзекабрыстаў мы запрасілі С. Букчына — аўтара кнігі аб дзекабрыстах у Беларусі «К мечам рванулись наши руки».

Вялікае значэнне мы надаём сувязі гуртка са школамі Мінска. Гуртkоўцы арганізавалі канферэнцыю ў СШ № 33, прысвечаную 80-годдзю першай рэвалюцыі ў Расіі.

Гуртkоўцы знаёмяцца з бібліяграфіяй гісторыі БССР, рыхтуюць інфармацыю аб навінках гістарычнай літаратуры.

У мінулым годзе нас непакоіла, што студэнты I і II курсаў слаба ўдзельнічаюць у рабоце гуртка. У гэтым годзе становішча выпраўляецца — да нас прыйшло шмат зацікаўленых першакурснікаў.

М. ГАЙБА.

УВАГА: ФОТА — КОНКУРС!

*ВЫ ТРЫМАЛІ ў руках фотаапарат? А можа, перажывалі сапраўдную радасць ад добрага здымка? Калі так, нясіце яго да нас! Рэдакцыя аб'яўляе фотаконкурс «Жыві, імгненне!»*

*Вынікі конкурсу будуць падведзены 5 мая 1987 года. Пераможцы будуць узнагароджаны ганаровымі граматамі і грашовымі прэміямі.*

*Жадаем творчых поспехаў!*



ПЕРАБУДОВА ВНУ: СТРАТЭГІЯ І ТАКТЫКА ПАСКАРЭННЯ

# АСОБА ВЫКЛАДЧЫКА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

«Камуністычная партыя Беларусі на сучасным этапе: арганізацыйная, ідэалагічная дзейнасць, кіраўніцтва народнай гаспадаркай».

НАЛЕЖЫЦЬ удасканаліць партыйнае кіраўніцтва падрыхтоўкай кадраў гісторыкаў. Бо з практыкай работы партыйных і савецкіх органаў мы звязаны ўсё ж недастаткова. Пэўная частка гісторыкаў партыі далёкая ад канкрэтнага ведання рэальных праблем паўсядзённага жыцця і дзейнасці партыйных арганізацый. На гэты бок праблемы трэба звярнуць сур'ёзную ўвагу як з мэтай пераадолення схематычнага тэарэтызавання і даказвання грамадазнаўцамі ўжо даказанага, аб чым гаварылася на XXVII з'ездзе партыі, так і ўлічваючы той факт, што на кафедры ўсё больш прыходзіць моладзь, якая не ведае практыкі партыйнай работы. ВНУ, адзін-два гады работы, а ў іншых выпадках і таго менш, потым аспірантура — вось шлях многіх цяперашніх выкладчыкаў. Важную ролю ў падрыхтоўцы кадраў гісторыкаў партыі як пачынаючых, так і ўжо сталых, адыграла б іх стажыроўка ў партыйных, камсамольскіх, савецкіх органах. Размова ідзе аб тым, каб узняць на больш высокі ўзровень ведання выкладчыкамі гісторыі КПСС практыкі партыйнай работы.

Уяўляецца, што неабходна карэнным чынам палепшыць фарміраванне маладога гісторыка партыі — ад падбору таленавітай моладзі, арганізацыі яе навучання ў аспірантуры, абароны дысертацыі да накіравання на работу. Выкладчыку гісторыі КПСС павінны быць арганічна характэрны высокі палітычны ўзровень, веданне справы, арганізацыйныя здольнасці, уменне працаваць з людзьмі, патрэбнасць жыць іх інтарэсамі і запатрабаваннямі.

Трэба дамагчыся, каб паступаючыя ў аспірантуру мелі рэкамендацыю абкома партыі. Бо нават студэнты, якія паступаюць на грамадазнаўчыя аддзяленні, накіроўваюцца абкомамі партыі, а для паступлення ў аспірантуру гэтага чамусьці не прадугледжана. У выніку сюды па мэтавых накіраваннях ВНУ ідуць не заўсёды лепшыя. Часам да нас накіроўваюць «мэтавікаў», у якіх здавальняючыя адзнакі па прафілюючаму прадмету, няма працоўнага стажу. Аднак пры адсутнасці конкурсу частка з іх паступае ў аспірантуру, а потым, не абараніўшы дысертацыю, вяртаецца ў ВНУ, якая іх накіравала.

У сувязі з гэтым мэтазгодна вырашыць пытанне аб тым, каб нават пры наяўнасці мэтавых месц дазволіць жадаючым падаваць заявы, а ў выпадку іх паступлення накіроўваць на працу ў тую ВНУ, на мэтавае месца якой яны былі залічаны. Было б разумна афіцыйна забараніць вышэйшым навучальным установам накіроўваць у мэтавую аспірантуру асоб, якія не прарабілі ў данай ВНУ нават года альбо маюць здавальняючыя адзнакі па прафілюючых дысцыплінах.

МЫ з задавальненнем успрынялі прапанаваную адмену публікацый для спаборнікаў на атрыманне кандыдацкіх ступеней. Справа ў тым, што для многіх аўтараў гэта была практычна першая творчая спроба, часам яшчэ тады, калі яны не паспелі належным чынам увайсці ў тэму. Да таго ж, гэта стварала дадатковыя цяжкасці для публікацыі рэзультатаў навуковых даследаванняў для штатных супрацоўнікаў апорных кафедраў, бо трэба было своечасова дапамагчы з публікацыямі аспірантам. Цяпер становішча некалькі аблегчыцца.

Аднак праблема публікацый, асабліва па доктарскіх дысертацыях, застаецца. Думаецца, што ў гэтай справе настаў час навесці парадак. Тэмы доктарскіх дысертацый зацвярджаюць каардынацыйныя саветы рэгіёнаў, іх у абавязковым парадку разглядае Прэзідыум Усесаюзнага савета па каардынацыі навукова-даследчай работы ў галіне гісторыі КПСС і партыйнага будаўніцтва. Уяўляецца, калі гэтыя аўтарытэтныя органы знайшлі праблему актуальнай, то Дзяржкамітэт па друку павінен даць адпаведныя ўказанні выдавецтвам аб друкаванні даных работ. Безумоўна, пры іх высокай якасці.

Такі падыход дазволіў бы палепшыць падрыхтоўку доктараў навук і лепш асвятляць розныя перыяды гісторыі КПСС, паказваючы дыялектычную ўзаемасувязь былога і сучаснага, сувязь гісторыі з сучаснасцю. Хацелася б, каб МінВНУ СССР вырашыў пытанне аб выданні спецыяльнага часопіса для гісторыкаў партыі, на старонках якога знайшлі б адлюстраванне і праблемы падрыхтоўкі кадраў.

НАСПЕЛА неабходнасць распрацаваць палажэнне аб апорных кафедрах. Сёння мы ў асноўным уяўляем свае абавязкі, але якія ж у нас правы? У год кожны выкладчык кафедры на грамадскіх асновах чытае 2—3 дысертацыі, а нават на рэцэнзаванне дыпломнай работы адводзіцца 4 гадзіны.

У мэтах далейшага ўдасканалення вучэбна-выхаваўчага працэсу, паляпшэння прафесійнай падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў па гісторыі партыі ў шэрагу універсітэтаў краіны ўведзена спецыяльнасць па гісторыі КПСС. Практыка мінулых гадоў паказала, што неабходна ўдасканаліць адбор студэнтаў для спецыялізацыі. Справа ў тым, што на месцах далёка не ўсюды адносяцца да гэтага сур'ёзна. Некаторыя маладыя людзі, рэкамендаваныя на вучобу, нічым сябе не паказалі, маюць слабую агульную падрыхтоўку, часам не ўяўляюць сваёй будучай прафесіі. У гэтай сувязі ўсё вастрэй адчуваецца неабходнасць лепшага прафесійнага адбору будучых гісторыкаў партыі. А для гэтага неабходна больш глыбокае веданне тых ці іншых псіхалагічных якасцей спецыяліста, псіхалагічнага партрэта прафесіі. Відаць, партыйныя органы, кіраўніцтва ВНУ павінны вызначыць крытэрыі для адбору і падрыхтоўкі кадраў выкладчыкаў гісторыі КПСС. Праблема як быццам не новая, аднак ад яе правільнага вырашэння залежыць вельмі многае.

Мы падтрымліваем прапанову Праекта ЦК КПСС аб перабудове вышэйшай школы, дзе рэкамендуецца ВНУ весці адбор студэнтаў па прызванню, аддаючы перавагу юнакам і дзяўчатам, якія прадэманстравалі прыхільнасць да выбранай прафесіі. Уяўляецца мэтазгодным перайсці на доўгачасовыя формы прафарыентавання моладзі. У гэтых адносінах можна было б шырэй выкарыстоўваць падрыхтоўчыя аддзяленні ВНУ, больш актыўна прыцягваць да падбору абітурыентаў выкладчыкаў кафедраў, на якіх ажыццяўляецца падрыхтоўка будучых гісторыкаў партыі.

Што датычыць арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу на аддзяленнях гісторыі КПСС, то было б карысным сабраць усіх зацікаўленых, абмяняцца назапашаным вопытам і дамовіцца аб адзінстве патрабаванняў. Потым даручыць асобным кафедрам скласці праграмы абавязковых дысцыплін і спецкурсаў, абмеркаваць іх і рэкамендаваць для работы. Гэта б садзейнічала больш паглыбленаму вывучэнню ўсіх складаемых частак марксісцка-ленінскай тэорыі, паляпшэнню агульнагістарычнай і спецыяльнай падрыхтоўкі, фарміраванню ідэйнасці, ператварэнню ведаў у глыбокія камуністычныя перакананні.

У. КОРШУК,
загадчык кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў, доктар гістарычных навук, прафесар.

ШТРЫХІ ДА ПАРТРЭТА



Калі б табе, таварыш студэнт, даручылі акадэмічны сектар, з чаго б ты пачаў сваю работу? Наташа Равяка пачала яе з яшчэ больш патрабавальных адносін да сябе. Дзяўчына лічыць, што патрабаваць сур'ёзных адносін да вучобы можа толькі той, хто сам добра вучыцца. Наташа — студэнтка трэцяга курса гістарычнага факультэта. Яна любіць гісторыю. Вучыцца на «добра» і «выдатна». Аднакурснікі адзываюцца аб ёй як аб старанным, чулым чалавеку. Хутка чарговая сесія. Безумоўна, Наташа здасць яе на «4» і «5». Але гэтага ёй мала. Яна імкнецца, каб і ўся група здала сесію таксама паспяхова.

Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

ПРАФІЛАКТОРЫЙ

# «КАЛІ ЛАСКА!»

— такімі ветлівымі словамі сустрэлі мяне ў прафілакторыі БДУ, які заняў два паверхі інтэрната № 3 на адной з ускраін нашага горада.

ПРЫЕХАЛА я сюды, каб адказаць для сябе, ды і для вас, паважаныя чытачы, вось на такое пытанне: «Чаму студэнты не жадаюць адпачыць і падмацаваць сваё здароўе ў прафілакторыі? Чаму замест 100 чалавек у апошні заезд тут апынулася толькі 68?» Пытанне гэта заклапаціла не толькі адну мяне — на апошнім пасяджэнні прафсаюзнага камітэта БДУ шмат аб гэтым гаварылася.

І вось я ў прафілакторыі. Першы чалавек, які сустрэўся, — загадчык гаспадаркі Зінаіда Сцяпанаўна Бурая. Выслухаўшы мяне, Зінаіда Сцяпанаўна сказала: «Пойдзем паглядзім, як жывуць нашы студэнты, навошта шмат гаварыць».

На III паверсе мы зайшлі ў пакой. Нас сустрэлі студэнткі ФПМ І. Клопат, А. Шчэрбач, А. Тракала, якія вучацца на IV курсе. У прафілакторыі яны ўпершыню. «Трапіць сюды амаль немагчыма, вельмі хацелася б застацца яшчэ, але наш факультэт адзін з самых шматлікіх»,— развяла рукамі Ірына Клопат.

Заглянуўшы амаль у кожны пакой, я пераканалася ў тым, што ганарыцца персаналу прафілакторыя сапраўды ёсць чым: чыста, акуратна, утульна, з каляровым тэлевізарам і кветкамі на вокнах хол, дывановыя дарожкі на калідорах, цішыня. Аб многім сказалі мне і тыя запісы, якія былі пакінуты на старонках «Кнігі скаргаў і пажаданняў» удзячнымі людзьмі. Не аднойчы ўпаміналіся там прозвішчы ўрача-стаматолага В. У. Давыдавай, урачоў М. Б. Канапелькі, Д. У. Садчыкавай і іншых.

А з якім гонарам паказала мне медсястра Н. П. Грыгор'ева працэдурныя кабінеты. «Калі ласка, не памыліцеся, вось гэты апарат называецца «Рамонак», а гэты — «Прамень-3». І адзін, і другі дапамагаюць пры хранічных захворваннях. А яшчэ ў нас ёсць «Электрасон» і падводны душ-масаж...»

Давялося пагутарыць мне і з галоўным урачом М. Б. Канапелька, які адзначыў, што, нягледзячы на шматлікія «плюсы», у прафілакторыя яшчэ шмат праблем, вырашыць якія не так лёгка.

І як бы падагульняючы нашу гутарку, М. Б. Канапелька звярнуўся ўжо да мяне: «Паспрабуйце пераканаць нашых студэнтаў у тым, што хоць час ад часу трэба звяртаць увагу на сваё здароўе!»

Т. ХУДОБА,
студэнтка факультэта журналістыкі.

АМАЛЬ АСАБІСТАЕ

# Вячэрні роздум

Вечар, не па-восеньскі ясны. Блякла-ліловая палоска заходу на ўжо густа-сінім небе. Вялізныя, высокія зоры. Настрой лірычны, хочацца слухаць ціхую музыку і чытаць вершы.

«Открылась бездна, звёзд полна...» Не, толькі не гэта! Ламаносава мы «праходзілі» на мінулым тыдні. Хоць сёння не буду думаць пра школу.

«Октябрь уж наступил — уж роща отряхает последние листы с нагих своих ветвей...» Шкада, што Пушкін толькі ў другой чвэрці. Што гэта я? Зноў пра школу?

Вось! Ахматаву ў школе не вывучаюць. «Так вот он — тот осенний пейзаж, которого я всю жизнь боялась: и небо...» Складаназалежны сказ з дадатковым азначальным. Ды яшчэ і з указальным словам! І галоўнае — сказ цікавы для разбору. Трэба будзе паспрабаваць даць у класе. Зноў пра школу!

Няўжо гэта на ўсё жыццё: я ніколі не змагу ўспомніць аб Пушкіне ці Лермантаве, не падумаўшы пры гэтым пра школу?!

Люблю правяраць сшыткі. Ванечку Ільюкевіча можна цэлымі абзацамі цытаваць: «Простакова не вежественна она очень любит своего сына. Если он чуть хуже чувствует то вызывает врача. Она балывыет разрешает все что ему хочется».

Гэта з пісьмовага апытання па тэме «Класіцызм». Калі чытала работы, смяялася да знямогі. А потым плакаць хацелася бялугай. Мне здавалася, што ў мяне былі добрыя ўрокі па Мальеру і Дзяржавіну. І настаўніца хваліла. А адзін вучань напісаў, што «Мешчанін у дваранстве» — твор Г. С. Дзяржавіна. Вось і плады маёй працы.

Школа прыносіць і радасці, і засмучэнні. Радасцей, бадай, болей. І вельмі шмат клопатаў. Школа запаўняе сабой усё. У верасні — кастрычніку пяцікурснікі гавораць толькі пра школу. Размова, якая пачалася зусім з пабочнай тэмы — хоць з «лятаючых талерак», хоць са сталовага сервіза ў «Крышталі» — як Сізіфаў камень з гары, скоціцца да ўрокаў, сшыткаў, любімых двоечнікаў, сачыненняў і г. д. Ды і пра што гаварыць яшчэ?

Усхопліваемся ў 6 гадзін раніцы, таму што ў школу дабірацца цэлую гадзіну, а знешні выгляд павінен быць бездакорным — сорак пар вачэй за сорак пяць мінут выглядзяць любы недахоп.

Стаіш у тралейбусе (сядзець нельга — скамечыцца сукенка) і, хваравіта ўздрыгваючы пры кожным наступленні на нагу (жах! вучні ўбачаць мяне ў запэцканых туфлях!!!), пра сябе паўтараеш ход урока.

Ужо за 200 метраў да школы «нацягваеш» на твар паважна-добразычлівы выраз і пачынаеш ветліваківаць вучням, якія вітаюцца з «практыканткамі».

Урокі. «Класіцызм узнік у Старажытным Рыме ў IX стагоддзі». (Адкуль яны гэта ўзялі?) Федарук прынёс на кантрольную дыктоўку падзорную трубу, каб спісваць. Зусім забылася — трэба выставіць у журнал адзнакі за дыктоўку. «Прастакоў, як мядуза ў руках сваёй жонкі...» Сэрца маё растае ад захаплення перад вобразнасцю мыслення вучня.

Абапіраючыся на настаўніцкі стол, апусціўшы вочы, і рыхтуючы загадзя непадкупляльна-строгі погляд, роўным і бясстрасным голасам ціха кажу: «Падыміце рукі, хто не прачытаў сённяшні ўрок?». Падымаю вочы — чатыры рукі. Ух, гара з плеч! У мінулы раз было наадварот — толькі чатыры прачыталі.

Стос сшыткаў. «Стародум поехал на заработки в Сибирь...» «Простаковы — простые, семейные люди...»

У тралейбусе. Валодзя вельмі глыбокі хлапчук... Трэба напісаць картку спецыяльна для Аксаны. Алег сёння чамусьці не вярцеўся...

Дома. Не, ім так будзе сумна. Што ж прыдумаць? Якія нудныя сказы ў падручніку. Я сёння абедала? Чаму Цютчаў не пісаў свае вершы складаназалежнымі сказамі? Я катастрафічна не дасынаю. Пазаўчора ў сне вяла ўрок, і хранічны парушальнік дысцыпліны Саша Лісюхін нязвыкла сканцэнтравана працаваў па картцы, а звычайна маўклівы Максім Крукевіч нясмела падняў руку. Я, абрадаваўшыся, прачнулася. Відаць, пачуць яго адказ мне не давядзецца нават у сне.

Школа... У верасні мы часта з жахам думаем: «На два месяцы!» Зараз у мяне падазрона пачынаюць шчыпаць вочы пры думцы пра апошні ўрок у чвэрці (і на практыцы, і ў гэтым класе, і ў гэтай школе, і наогул у Мінску). І я гарачліва думаю: «Ну і хай сабе! Вось пайду працаваць — у мяне будуць вучні яшчэ лепшыя, можа быць!»

Жах! Час позні, а я яшчэ не прадумала заданне. Мару тут аб нечым, а пра школу забылася...

В. ФЕЛЬКІНА,
студэнтка філалагічнага факультэта.

# У НАС У ГАСЦЯХ НАСЦЕННАЯ ГАЗЕТА...

**Vita**

Выходит с 1948 г.

2 (315)

**Редколлегия**

*НАША ГАЗЕТА, газета біялагічнага факультэта «Vita» адкрывае парад-але насценгазет універсітэта на старонках «Беларускага універсітэта». Па-нашаму, гэта вельмі правільна! «Vita» з лацінскага азначае «жыццё». Да таго ж, газета больш дваццаці гадоў лічыцца лепшай ва універсітэце.*

*...Зацікаўленыя диходлівай аб'явай, вы зможаце трапіць на пасяджэнне рэдкалегіі ў 712 аўдыторыю і напэўна са здзіўленнем убачыце ўсяго толькі 3—4 чалавекі, якія завіхаюцца над ватманам. Гэта значыць, што да выпуску газеты яшчэ тыдзень. А ў дзень перад выпускам нас збіраецца ўсіх 10 функцыянераў газеты, бо мы хвалюемся — якая яна атрымаецца?..*

А. ВІНЧЭЎСКІ,
рэдактар газеты
«Vita».

Знаёмства з газетай «Vita» арганізавала член прэс-цэнтра Людміла Дзякун, студэнтка III курса факультэта журналістыкі.

## НАШ ФОТАКОНКУРС

## Здымае Ігар Бышнеў



*ВЫПУСКНІК біялагічнага факультэта Ігар Бышнеў пасля заканчэння універсітэта звязаў свой лес з арніталогіяй. Сёння ён — малодшы навуковы супрацоўнік Бярэзінскага запаведніка. Са студэнцкіх гадоў Ігар пачаў займацца фотапаляваннем, быў членам рэдкалегіі газеты «Vita». З кожным годам расце майстэрства фотааматара. Здымкі яго друкаваліся ў «Знамени юности», рыхтуюцца да друку ў часопісе «Родная прырода». Не забывае Ігар і свой «Беларускі універсітэт»...*







НА ЗДЫМКАХ: 1. Пасля палявання скапа вяртаецца ў гняздо. 2. Узлёт (скапа на гняздзе). 3. Чаглок і яго птушаняты.

## МАЦАВАЦЬ ТРАДЫЦЫІ

### УНІВЕРСІТЭТЫ — ПАБРАЦІМЫ

**Вось ужо шмат гадоў існуе добрая традыцыя: у ліпені да нас прыязджаюць студэнты біялагічнага факультэта Сафійскага універсітэта імя К. Ахрыдскага на вытворча-азнаямленчую практыку, а ў жніўні студэнты нашага факультэта з той жа мэтай наведваюць Сафійскі універсітэт. Калі вучылася, давялося і мне пабываць у Сафіі.**

НАША група на чале з дэканам факультэта дацэнтам А. С. Шуканавым прыбыла ў Балгарыю ў канцы жніўня. Першыя балгарскія гарады, якія мы наведалі, былі Горна-Арэхавіца і Вяліка-Тырнава. Потым мы паехалі ў Варну, дзе правялі 10 дзён. Пасялілі нас на базе біялагічнага факультэта.

Тут мы пазнаёміліся з балгарскімі студэнтамі, якія працавалі ў брыгадзе, убачылі аб'екты іх працы: біястанцыю і батанічны сад. Разам з нашымі новымі сябрамі адпачывалі на моры і праводзілі свой вольны час.

У старэйшым батанічным садзе сабраны вельмі ўнікальныя калекцыі руж і кактусаў. Нас уразіла не толькі багатая калекцыя рэдкіх відаў раслін, але і хараство рэстаўрыраванага палаца, на тэрыторыі якога знаходзіцца батанічны сад.

Вытворчая практыка заключалася ў знаёмстве з біялагічным факультэтам, якое пачалося з кафедры фізіялогіі раслін. Потым мы пабывалі на кафедры заалогіі, паслухалі расказ дацэнта гэтай кафедры І. Васілова аб навукова-даследчай рабоце, якую праводзяць студэнты. Найбольш цікавай і карыснай была гэта сустрэча для студэнта кафедры заалогіі нашага факультэта І. Максіменкава, бо тэма яго навуковых пошукаў супала з тэмай навуковай працы І. Васілова. Пасля кафедры заалогіі мы наведалі лабараторыі і гербарый кафедры батанікі.

Для мяне самым незабыўным было знаёмства з кафедрай фізіялогіі чалавека і жывёл. Тут мы мелі магчымасць паглядзець апаратуру, на якой праводзяцца даследаванні, даведаліся аб праблемах, якімі займаецца кафедра.

Час, праведзены на факультэце, быў для нас каштоўным яшчэ і таму, што мы атрымалі магчымасць пазнаёміцца з вельмі цікавымі людзьмі, выкладчыкамі, супрацоўнікамі і студэнтамі.

Надоўга застанецца ў нашай памяці гэта паездка, сардэчны прыём нашых балгарскіх сяброў, помнікі старажытнасці і архітэктуры, з якімі мы пазнаёміліся ў Сафіі, Плоўдзіве, Варне, Вяліка-Тырнава.

Р. ДЗІКАВІЦКАЯ,
супрацоўніца біялагічнага факультэта.

### ТУЗІН ПЫТАННЯЎ

## Лёгкай працы не шукаем!

**Паспрабую сцісла апісаць жыццё і працу нашага будатрада на «будучай» Вілейскай біябазе. Да гэтага часу яшчэ «будучай», нягледзячы на тое, што будуецца яна ўжо 10 гадоў. За гэты вельмі працаёмкі тэрмін пачалі разбурацца некаторыя найбольш «старажытныя» пабудовы: цэгла крышыцца, рамы некуды «уцякаюць». Калі сумленна, то відовішча не з прыемных. Вось на гэтым будаўніцтве мы і з'явіліся.**

ПА ДАРОЗЕ нас весялілі апавяданнямі пра тое, якія там, на Вілейшчыне, цудоўныя мясціны, багацце грыбоў і ягад, а на біябазе, г. зн. біястанцыі — усё, што душа жадае: халадзільнік (на табе!), машына (калі ласка!), электрычная плітка (і такая ёсць!).

Мы, зразумела, верылі гэтаму апавядальніку, ды і як не верыць, калі ён — сам дырэктар біябазы.

Але на месцы ўсё, за выключэннем прыгажосці прыроды, мора грыбоў і ягад, аказалася далёка не такім, як апісваў дырэктар. Быў, праўда, халадзільнік, але няспраўны, бо спраўны невядома куды звезлі рабочыя ПМК, была і машына, і плітка (дзіўна, але зноў жа няспраўныя). Добра хоць прадукты такія-сякія засталіся ад папярэдняй брыгады. Хлеб, праўда, прыйшлося пазычаць у суседзяў-наргасаўцаў. У іх было ўсё: і печка добрая, і машына на хаду, і ўсе неабходныя прадукты, хаця яны толькі-толькі пачалі будаваць свой аб'ект.

Кіраўніцтва ПМК заўважыла нашу прысутнасць на будоўлі толькі праз 5 дзён. Прыехаў майстар, паспачуваў нам: маўляў, без машыны ў гэтых мясцінах цяжкавата (да бліжэйшай вёскі больш трох кіламетраў), пазнаёміў нас з планам работы на жнівень.

Большасць з нас мела які-ніякі вопыт будаўнічых работ, узяліся за справу дружна. Працавалі 17 дзён, з іх тры — на другім аб'екце. Імкнуліся працаваць з поўнай аддачай, але, відаць, дарэмна: аб'ём работ хутка скончыўся. Калі б не спяшаліся, то можна было б на цэлы месяц расцягнуць працу, а гэта, напэўна, і ўваходзіла ў планы майстра.

Ды і яго ў нейкай ступені можна зразумець. Кладку і аддзелачныя работы весці мы не ўмеем, а бетонныя і мантажныя справы скончыліся вельмі хутка. Спачатку мы турбаваліся, прасілі, а потым ўзнікла пачуццё непатрэбнасці сваёй. Энтузіязм патух. Ад яго не засталося і следу, як гаворыцца, на фінішы, калі нам заплацілі. Рабочыя, якія працавалі побач з намі, атрымалі ў сярэднім па 7 рублёў за дзень, а мы — па 3—4 рублі.

Рэдкалегія прасіла зрабіць некаторы прагноз на будучае ў будаўніцтве базы. Мяркуючы па словах майстра, галоўнага інжынера па ТБ ПМК, базу павінны здаць у 1987 годзе. Наколькі гэта імаверна, я не ведаю. Але вось пра працу студэнтаў летам 1987 года можна сказаць, што яны будуць там... прыбіраць смецце. Гэта словы майстра, які адказвае за гэты ўчастак.

Узнікае пытанне: а ці варта накіроўваць студэнтаў займацца такой працай? Мы ж можам зрабіць у другім месцы больш, будоўляў у рэспубліцы, ды і ў краіне хапае. Ды і чаму самі рабочыя не могуць прыбраць за сабой? Можа на гэту працу яны не жадаюць ісці? Але і мы ўжо не дзеці, мы хочам і ў матэрыяльным плане быць незалежнымі ад бацькоў.

С. САКАЛОЎСКІ,
студэнт біялагічнага факультэта.




# Трэцяга і васемнаццатага: з 14 і да 17.00

А ЎЧОРА чыталі ў «Знамени юности»?..

— Вы гатуеце дранікі з грыбамі?..

— Ой, яна ў мяне ўвесь час хварэе: і зімой, і летам!..

— Ненармальны, адабраў канспект і гаворыць: прыйдзеш на спатканне — аддам...

— Ну што вы, хіба можа газета выдумляць?..

— Пакладзіце адзін сушаны грыб, а задавальненне — як у лесе прагуляўся!..

— Вазіла яе ў Еўпаторыю, а там — 10 рублёў у суткі на чалавека...

— Прыходжу на спатканне — ні яго, ні канспекта...

«Што за лухта?» — падумае чытач і будзе часткова правы, таму што такія размовы многім з нас прыходзіцца весці і выслухоўваць на працягу некалькіх гадзін два разы ў месяц. Так, так, у пачатку і ў сярэдзіне месяца, у дні выдачы зарплаты і стыпендый. Здзяйсняючы нялегкі занятак, прастойваючы па некалькі гадзін запар (зрэшты, каму з нас не прывыкаць да гэтага!), незнаёмыя людзі бавяць сябе гутаркамі. Пра іншых, каго бачыш упершыню, можна даведацца, што называецца, з першых вуснаў такое, чаго не ведаеш і аб сваіх блізкіх. У чарзе можна закрануць адвечныя пытанні маралі і філасофіі, разгледзець палітычнае становішча ў свеце, занатаваць кулінарны рэцэпт, даведацца аб апошніх ускрыках моды...

Шкада толькі, што ўсе гэтыя «карысныя» гутаркі адхопліваюць добрую палову працоўнага дня. Каса адчыняецца ў 14 гадзін, але ўжо ў 12 ёсць у каго запытаць: хто апошні? А калі прыйдзеш, напрыклад, у 15 гадзін — шмат шансаў на тое, каб не дачакацца сваіх грошай, бо каса зачыняецца акурат у 17.00. Свае рабочыя пасты кідаюць вахцёры, гардэробшчыкі, зачыняюць на ключ лабараторыі навуковыя супрацоўнікі, ахвяруюць заняткамі на факультатыве ці ў бібліятэцы старасты.

Чарга неспакойная, нервовая, у пастаянным стрэсавым напружанні. Час ад часу то тут, то там успыхваюць класічныя сваркі: «Я тут стаяла! — Вас тут не стаяла!».

Працэдура кантакту з касірам займае самае вялікае мінуты дзве. Калі наперадзе чалавек 30—40, гэта аднак не азначае, што ў жаданага акенца вы будзеце праз гадзінудругую. Бо колькі б ні рабіў прыступаў наперад, абавязкова робіш іх і назад: вунь, прыбег цэлы аддзел супрацоўнікаў, а вунь бягуць землякі да землякоў, швагеры да швагераў.

Затое на наступны дзень — пры-

## МАЛЮНАК З НАТУРЫ

гажосць! Хоць танцы танцуй каля касы, ніхто слова не скажа — бо няма нікога.

Грошы выдаюць тры дні, потым, як вядома, пералічваюць на дэпанент. Часткова гэта растлумачвае, чаму народ хвалюецца іменна ў дзень палучкі, ды і згадзіцеся, каму не прыемны гэты дзень, навошта яго адкладваць?

Дзіўна, што відавочнасць неразумнасці апісанай чаргі такая, што яе звычайна не заўважаюць, лічаць натуральнай. Зрэдку аднак хто-небудзь і заўважыць: навошта нам гэта чарга? Потым змоўкне, бо яму ў адказ: усе стаяць і ты пастаіш!

Але нешта трэба рабіць. Ці касіраў больш, ці ўвесці прынцып, калі заробак выдаецца праз ашчадную касу па ашчаднай кніжцы. Маюць жа такую магчымасць іншыя ўстановы!

Але набліжаецца чарговы дзень выдачы грошай, і зноў бачу даўжэзную шлангападобную чаргу...

А. ПАДЭРНА.

# «Ходу няма!»

*КОЖНЫ ВЕДАЕ, што найкарацейшая адлегласць паміж дзвюма кропкамі — гэта прамая. Але не кожны ведае, што правілам геаметрыі ў паўсядзённым жыцці карыстацца трэба не ва ўсіх выпадках.*

*Год назад адміністрацыя універсітэцкага гарадка вырашыла абмежаваць сваю тэрыторыю. Свая рацыя ў гэтым рашэнні была: бо зусім неабавязкова, каб розныя пабочныя асобы беспераШкодна блукалі па універсітэцкаму гарадку. Так ужо размешчаны універсітэт, што, знаходзячыся каля самага вакзала, ён служыць нібы прахаднымі варотамі на Ленінскі праспект.*

*Асаблівых эксцэсаў не прыпомню, але успамінаецца такі малюнак: смелая, калі не сказаць нахабная, цыганка-варажбітка затрымлівае каля геаграфічнага корпуса студэнтак. І што вы думаеце, студэнткі спыняюцца, і з шырока адкрытымі вачыма слухаюць варажбітку: атрымаюць залік або не, выйдуць у гэтым семестры замуж ці ў другім. Трэба дадаць, што гэты выпадак здарыўся ўжо апасля таго, як двор агарадзілі.*

*Вывад? Каму патрэбна, той заўсёды знойдзе ў ім дзірку. А што датычыць нашай агароджы, то ў ёй яе і не патрэбна шукаць — настолькі яна ўмоўная.*

*І вось тут я хачу перайсці да другога боку пытання — пасля якога ў многіх студэнтаў, ды і чаго маўчаць, супрацоўнікаў з'явіліся маленькія нязручнасці. Бо шмат з іх карыстаецца паслугамі транспарту, які ходзіць праз вакзал. Што датычыцца гасцей, дык з імі зусім складана: пакуль растлумачыш ім пра маленькую вузенькую фортку з боку вуліцы Бабруйскай, пакуль яны яе адшукаюць! А бывае яшчэ вельмі цікава, калі фортка па нейкіх прычынах зачынена, і прыходзіцца рабіць немалы круг, або... сігаць праз агароджу...*

*І яшчэ аб перпендыкулярах і газонах. Калі людзей, якія закідваюць ногі на агароджу, я магу па-свойму зразумець, то грамадзян, якія штодзень топчуць сцяжынкі на газонах, не разумею ніяк. Звышспяшаючыяся людзі: яны эканомяць кожную секунду, разлічваюць кожны крок або проста некультурныя? Сярод іх і выдатнікі, і двоечнікі, і выкладчыкі, і сакратаркі. Куды ж вы так спяшаецеся?*

В. АЛЕНІНА.

*P. S. Хочацца яшчэ раз звярнуць ўвагу, і ў першую чаргу ўвагу адміністрацыйна-гаспадарчай службы да агароджы. Бо ў пытанні: патрэб-*

## НАТАТКІ ПРАЗ ВАКНО

*на яна ці не? — прысутнічае яшчэ адна дзеючая, правільней, бяздзеючая асоба — бяссэнсавая дарога, якая вядзе нікуды. Навошта тады патрэбна яна, калі па ёй забаронена хадзіць? Ці можна растлумачыць гэты маленькі парадокс?*

*Фотаілюстрацыя С. ПЛЫТКЕВІЧА.*



## ФЕЛЬЕТОН

# ГІПНОЗ — вялікая сіла!

КАЛІ МЫ ДАВЕДВАЕМСЯ з прэсы пра нейкіх шарлатанаў-экстрасенсаў, то здзіўляемся таму, які доўгі час праходзіць з моманту пачатку іх дзейнасці да таго, калі наступае грамадскае выкрыццё. Маўляў, калі б я з такім сутыкнуўся, я адразу б яго распазнаў. Ён бы мне галаву не задурыў! Гэта ж і так бачна, калі чалавек выдае з сябе не тое, што ён ёсць на самой справе. Не, са мной бы такі нумар не прайшоў у яго! Але...

Шарлатаны-экстрасенсы тым небяспечныя, што ўмеюць маскіравацца пад маску таямнічага. Умела робяць выгляд, што ведаюць і маюць адносіны да нечага такога, што простаму «смяротнаму» у галаву не прыйдзе нават на адпачынку. Умеюць яны і ўплываць на наша інстынктыўнае здзіўленне перад незвычайным, дзівосным, якое штодзённа не сустракаецца ў жыцці.

Але слабыя яны тым, што абавязкова наступае час, калі сіла іх маскіроўкі непрыкметна для іх саміх становіцца бяссільнай і відавочнай для большасці «смяротных». Але, на жаль, доўга яшчэ яны знаходзяць прастачкоў, якія звычайны фокус успрымаюць за чыстую манету і адкрываюць ад здзіўлення рот.

Уважлівы чытач, напэўна, заўважыў, што ў апошнія гады ў прэсе было няма́ла матэрыялаў, якія расказвалі аб былых экстрасенсах. Былых не таму, што яны імі з'яўляліся на самой справе, але таму, што такімі іх лічылі мы. Усе гэтыя публікацыі маюць мэту не толькі выкрыць таго ці іншага канкрэтнага аферыста, даказаць яго небяспеку, але і маюць рацыю фарміравання грамадскай думкі: «экстрасенс? Гэта трэба даказаць!» Паверце, скептычны позірк на такога роду людзей не залішні. Таму, калі ён адсутнічае, хаця і не абавязкова, з вамі патэнцыяльна можа здарыцца ў якім-небудзь выглядзе якая-небудзь непрыемнасць. І пры гэтым можна застацца яшчэ, прабачце, у дурнях.

Навошта аўтар разважае з адукаванай аўдыторыяй пра нейкіх экзатычных экстрасенсаў? Якая яму розніца, як хто да іх ставіцца? Верыць у іх альбо не?

Справа ў тым, што я адкрыла рот ад здзіўлення, калі гэтай вясной мінулага вучэбнага года даведалася, што ў нас ва універсітэце выступаў адзін вось такі... Не, сябе ён экстрасенсам, можа, каб не прыцягваць занадта ўвагі, не называе. А называе проста і сціпла: урач, псіхолаг і гіпнатызёр. Згадзіцеся, такая кароткая характарыстыка і сапраўды вабіць, сама па сабе «гіпнатызуе». І я ўпэўнена, нават той, хто не пабываў на гэтым «паказе», даведаўшыся аб ім толькі зараз, пашкадаваў: гэта ж трэба, такія людзі бываюць ва універсітэце! Не шкадуй, паважаны чытач, Не многа ты згубіў. І я скажу, чаму.

Гіпнатызёра назавём па ініцыялах: А. Л. Праграму яго выступлення складаюць розныя нумары, так ці інакш звязаныя з гіпнозам. Прынамсі, з нагоды справядлівасці трэба заўважыць, што такой асаблівасцю А. Л. валодае, але ж як ён ёю карыстаецца...

Самы кульмінацыйны, эфектны нумар, па яго задумцы, які павінен даказаць сілу гіпнатызёрскага майстэрства А. Л., заключаецца ў наступным. На сцэну з залы А. Л. запрашае жадаючага. Яго кладуць на спінкі двух крэслаў, гіпнатызуюць, потым, быццам як на дошку, на яго ўзбіраецца сам «маэстра», а на твары загіпнатызаванага — ні ўздрыгвае нават ніводны мускул. Згадзіцеся, знешне гэта даволі эфектна, хаця і малаэстэтычна. Але А. Л. не абмяжоўваецца адным паказам, ён з падрабязнасцямі расказвае прысутным гледачам, які гэта вельмі складаны нумар, і што гіпноз у ім — рэч вялікая!

Усё не зусім так. І гіпноз тут можа быць ні пры чым. Хаця ў сапраўдным коле прафесіяналаў — апісанае шырока вядома, мае сваё тлумачэнне. Але заўважу, у даным выпадку гэта часцей за ўсё звычайны фокус.

Адзін са сведкаў, старшы інжынер кафедры фізікі і радыёэлектронікі Ю. Варатніцкі, які быў на паказе А. Л. у Палацы культуры будтрэста № 1, арганізаванага для гарадскога СБА летам гэтага года, расхваляваўся і паспрачаўся са сваімі таварышамі, што дакажа ім: А. Л. — звычайны дылетант і шарлатан. Пасля заканчэння «канцэрта» Ю. Варатніцкі, А. Малярэвіч, С. Сяргееў, члены камітэта камсамола БДУ у прысутнасці штаба СБА вырашылі паўтарыць усё кропля ў кроплю нават без падрыхтоўкі. І галоўнае — без усякага гіпнозу. І паўтарылі! Весела і не напружваючыся. А Юра Варатніцкі для агульнага смеху давёў арыгінальны нумар да канца: сваёй 95-кілаграмавай вагой (вагу Юры паведамляем з яго дазволу) наваліўся на выцягнутага на двух крэслах чалавека. І ўявіце сабе — гатоў вясёлы нумар для мастацкай самадзейнасці.

Гэта б яшчэ паўбяды, калі б так званыя А. Л. «псіхалагічныя вопыты» толькі дэманстраваліся! Яны яшчэ і суправаджаюцца падрабязнымі тлумачэннямі, якія разлічаны іменна на людзей, далёкіх ад ведання элементарнага.

Я запытала ў Юры: а як гледачы, верылі таму, што адбывалася на сцэне? І з задавальненнем пачула: не ўсе. Некаторыя адкрыта смяяліся з А. Л.

Але былі і іншыя гледачы. У канцы свайго выступлення А. Л. звычайна паведамляе аб сабе такія падрабязнасці як бы паміж іншым: лячу ад многіх хвароб — заіканння, неўрозаў, бранхіяльнай астмы, эпілепсіі, а таксама курэння і г. д. І жадаючым, а такіх, на жаль, заўсёды хапае, раздорвае шчодрай рукой самаробныя візіткі: адрас, тэлефон. І лёгкаверныя звоняць. І прыходзяць. Хто на самой справе з чаканнем цудадзейнай папраўкі, хто з цікавасці, а хто — ад нечага рабіць. Вельмі сумняваюся, што да каго-небудзь і сапраўды прыходзіць цудадзейнае здароўе. Такіх не ведаю, затое ведаю тых, хто схадзіў і пакінуў у кватэры на Ленінскім праспекце грошы. Сеанс каштуе 10 рублёў. Многа гэта ці мала: за кіло дылетанцкай лексікі, за метр дамарослай метады і адну мінутку «апускання» ў гіпнатычны транс? Што датычыцца «апускання» ў транс, то тут без падману. Але што дае гэты адзін сеанс? І таму прыходзяць зноў... Асабліва любіць А. Л., калі яго візіткі бяруць дзяўчаты, ім ён гатовы дапамагаць з найвялікшай ахвотай.

За гады сваёй бурнай дзейнасці А. Л. пабываў у многіх палацах, інстытутах, на прадпрыемствах, у вучылішчах, прафілакторыях. Не ўсе, трэба заўважыць, і гэта вельмі важна, згаджаліся на правядзенне «канцэртаў». Не ўсе, аказваецца, падкія на танныя эфекты, не ўсе давяраюць такім саматужнікам-адзіночкам. Можа таму, што асабіста адчуваюць адказнасць за сваіх падапечных. Словам, разумныя людзі адчуваюць, з кім не трэба мець справы.

Як жа адбылося, што гэты чалавек, якога цяжка назваць сапраўдным псіхолагам, урачом і нават масавіком-забаўнікам, змог дабіцца аўдыторыі ў БДУ? Якім чынам падпалі пад яго ўплыў прадстаўнікі універсітэта? А можа і сапраўды гіпноз — вялікая сіла?

А. ВІХРОВА.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
27 лістапада 1986 г.
АТ 07667. Зак. 1380.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 72-73.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЕЎ.